Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся !

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Якуб Колас

ВЯЛІКАМУ АБРАННІКУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Як светлае ранне,
Абнятае сонцам,
Расходзіцца радасць
Па нашай старонцы.

І кожны ўсхвалёван,
І кожны узнят:
Ён—родны наш Сталін,
Ён—наш дэпутат!

Напоўнены сэрцы
Пачуццем высокім,
Нас гордасць шугае
Патокам глыбокім.

Шуміць наша радасць,
Як майскі парад:
Праслаўлены геній—
Ён наш дэпутат!

І Молатаў, розум
Совецкай дзяржавы,
І Клім Варашылаў,
Шчыт воінскай славы.

І зоркія вочы
Вялікай зямлі,
Ежоў наш любімы—
Нам згоду далі!

Паднімем-жа вышэй
Чырвоныя сцягі!
Дастойнымі будзьма
Вялікай ўвагі,

Каб любы наш Сталін,
Зірнуўшы на нас,
Сказаў-бы: „Хвалю я,
Таварышы, вас!“

24 мая 1938 г.

ШТО ЧЫТАЦЬ

Да выбараў у Вярхоўны Совет БССР

І. В. Сталін. Даклад на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР. Партвыдавецтва ЦК ВКП(б), 1936 г.

І. В. Сталін. Прамова на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы 11 снежня 1937 г. Партвыдавецтва.

В. М. Молатаў. Аб выбарчым блоку камуністаў з беспартыйнымі. Прамова на сходзе Молатаўскай выбарчай акругі горада Масквы, 8 снежня 1937 г.

Н. І. Ежоў. Прамова перад выбаршчыкамі Горкаўска-Ленінскай выбарчай акругі горада Горкага 10 снежня, 1937 г.

К. Е. Варашылаў. Прамова на прадвыбарчым мітынгу працоўных горада Менска, 7 снежня 1937 года.

Л. М. Каганавіч. Прамова на мітынгу выбаршчыкаў горада Ташкента, 9 снежня 1937 года.

А. Я. Вышынскі. Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР у пытаннях і адказах.

А. Я. Вышынскі. Новы выбарчы закон СССР.

А. Я. Вышынскі. К гісторыі Совецкай Канстытуцыі.

М. І. Калінін. Што дала совецкая ўлада працоўным.

ЗА ВЯЛІКАГА СТАЛІНА, ЗА ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ РАДЗІМЫ

Выключна радасныя дні перажывае зараз наша Беларуская рэспубліка. З кожным днём набліжаецца 26 чэрвеня—дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Бязмежнае шчасце і гордасць ахоплівае працоўных ордэнаноснай БССР. Беларускі народ будзе выбіраць у свой рэспубліканскі парламент праводзіра народа—вялікага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў, главу совецкага ўрада—старшыню СНК СССР тав. Молатава, маршала Совецкага Саюза, калезнага Наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Выбаршчыкі горада Віцебска будуць галасаваць за сталінскага пітомца—Наркома ўнутраных спраў Наркома воднага транспарта Нікалая Іванавіча Ежова, за сакратара ЦК ВКП(б) тав. Жданава.

Выбаршчыкі горада Гомеля будуць выбіраць у дэпутаты майстра сталінскага стылю работы Наркома цяжкай прамысловасці і чыгуначнага транспарта Лазара Майсеевіча Кагановіча і сакратара ЦК ВКП(б) Андрэя Андрэевіча Андрэева. Выбаршчыкі Магілёва—старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Міхаіла Іванавіча Калініна. Выбаршчыкі Мозыра—Наркома лёгкай прамысловасці Анастаса Іванавіча Мікаяна.

Беларускі народ добра ведае, што ён абавязан правадыру народаў таварышу Сталіну за сваё шчаслівае і радаснае жыццё. Гэтую думку ўсяго беларускага народа выказала Ада Кісель на перадвыбарчым сходзе швейнай фабрыкі „Кастрычнік" горада Менска.

— Тое, аб чым вякамі марылі пакаленні, ажыццяўляецца ў нашыя сонечныя дні. Пышным цветам расквітнела БССР—дзецішча ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Там, дзе былі непраходныя балоты, цяпер узвышаюцца гіганты соцыялістычнай індустрыі. Багатым ураджаем квітнеюць калгасныя палі. Была ў мінулым загнана родная беларуская мова. Цяпер беларускі народ спявае радасныя песні на сваёй роднай мове.

Нашы сэрцы поўны ўдзячнасці да лепшага друга беларускага народа, вялікага і любімага правадыра працоўных, роднага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Партыя Леніна—Сталіна прывяла беларускі народ, прывяла кожнага з нас да радаснага і шчаслівага жыцця. Вялікі правадыр народаў прымаў непасрэдны ўдзел у вызваленні беларускага народа ад ярма белапольскіх акупантаў.

Беларускі народ будзе шчасліў аддаць свой голас за любімага Сталіна.

На вуснах выбаршчыкаў імя таго, з кім звязана вызваленне беларускага народа ад гнёта капіталістаў і памешчыкаў. З імем таварыша Сталіна звязан росквіт нашай соцыялістычнай Беларусі. З яго імем звязана правільнае вырашэнне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, у выніку чаго БССР атрымала сваю дзяржаўнасць і стала адной з адзінаццаці ззяючых рэспублік неабдымнага Саюза.

Беларускі народ з любоўю адносіцца да сваёй комуністычнай партыі і ўрада, таму з такім гонарам і радасцю аддасць свае галасы за главу совецкага ўрада тав. Молатава, за старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. Калініна, за тав. Кагановіча, Варашылава, Ежова, Жданава, Андрэева, Мікаяна. Выбаршчыкі аднадушна будуць галасаваць за лепшых сталінцаў, за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Фашысцкія найміты, подлыя з подлых шаранговічы, чарвяковы і іншая мразь хацелі адарваць Беларусь ад вялікай сям'і народаў. Ператварыць яе зноў у калонію фашысцкай Польшчы, зноў надзець ярмо капіталізма і ўтапіць у моры крыві шчаслівы беларускі народ. Але яны пралічыліся. Не бываць гэтаму ніколі! Совецкая разведка, якой кіруе наш слаўны кандыдат Нікалай Іванавіч Ежоў, раздавіла і раздавіць кожнага, хто адважыцца падняць руку на радаснае жыццё совецкага народа.

Беларускі народ вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР самых перадавых, самых лепшых людзей, выхаваных партыяй і совецкай уладай, людзей, якія на справе даказалі сваю адданасць партыі Леніна—Сталіна.

Выстаўлены і зарэгістраваны 69 жанчын кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Яны—слаўныя дочкі і патрыёткі нашай квітнеючай і любімай радзімы.

Выбаршчыкі горада Віцебска вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Еўгенію Саламонаўну Ханіну—дырэктара Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі „КІМ", выхаванку ленінскага комсамола і партыі. Яна сапраўды большэвіцкімі ўзорамі работы паказала сваю адданасць радзіме.

Або хто не ведае маладога, здольнага інжынера Аршанскага ільнокамбіната Марыю Антонаўну Сцяпанаву. Сваёй работай яна заваявала сабе вялікі аўтарытэт.

Пелагея Астапаўна Якуш—старшыня Рудзенскага РВК. Былая батрачка, зараз кіраўнік раёна.

Знатны ільнавод Анастасія Грыгор'еўна Міцкевіч, камбайнерка Ольга Канстанцінаўна Шарко, знатны ільнавод—ордэнаносец Праскоўя Канстанцінаўна Ціханская.

Спіс гэты можна працягнуць. Усе яны лепшыя з лепшых стаханаўкі прадпрыемстваў і соцыялістычных палёў, кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, партыйныя работнікі, настаўніцы.

Усе яны лепшыя з лепшых нашай ордэнаноснай Беларускай рэспублікі, людзі, праверапыя на рабоце і ў барацьбе з ворагамі народа, барацьбіты за справу Леніна—Сталіна.

Народ аднадушна вылучыў сваіх кандыдатаў і ён таксама аднадушна ў дзень выбараў 26 чэрвеня аддасць за іх свае галасы.

26 чэрвеня—у дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР—выбаршчыкі нашай ордэнаноснай рэспублікі панясуць да урнаў свае галасы і аддадуць іх за самых актыўных будаўнікоў комунізма, за загартаваных барацьбітоў за справу працоўных, за людзей, якія непрымірымы да трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў.

Беларускі народ яшчэ раз прадэманструе перад усім светам, што блок комуністаў і беспартыйных непераможны.

Лепшыя дочкі нашай радзімы вылучаны



Клаўдзія Амосаўна Абушэнка — трэці сакратар Менскага Абкома КП(б)Б—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Заслаўльскай выбарчай акрузе.



Сцепаніда Якаўлеўна Музыка—стахановка калгаса „Гігант", Петрыкаўскага раёна—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Петрыкаўскай выбарчай акрузе.

Таццяна Ільінічна Якушэва—сакратар Бабруйскага райкома КП(б)Б — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Рымавецкай выбарчай акрузе.

ТАЦЬЯНА ІЛЬІНІЧНА ЯКУШЭВА

Канкрэтнасць кіраўніцтва—важнейшая рыса партыйнага работніка Таццяны Якушэвай.

Увечары, вяртаючыся з перадвыбарнай нарады Рымавецкай выбарчай акругі, дзе яна выступала перад сваімі выбаршчыкамі, Таццяна Ільінічна, не заязджаючы дамоў, пабывала ва ўсіх выбарчых акругах Бабруйска, каб самой пераканацца, як прайшлі перадвыбарчыя нарады, рэгістрацыя кандыдатаў і інш.

— Ну, цяпер можна крыху і адпачыць,—сказала ўжо ўначы Таццяна Ільінічна, пераканаўшыся, што ўсё ў парадку.

Роўнапраўе жанчыны—адно з важнейшых заваяванняў совецкай улады. Дастаткова пабываць адзін раз на пасяджэнні Бабруйскага райкома партыі, каб пераканацца ва ўсёй здзейсненасці сапраўднага роўнапраўя—спрадвечнай мары лепшых людзей чалавецтва.

За вялікім сталом з чарнільным прыборам, чатырма тэлефонамі з боку і кіпай акуратна складзеных спісаных паперак сядзіць яшчэ маладая, невялікая жанчына. Рост яе яўна не адпавядаў ні велічыні стала, за якім яна сядзела, ні шырокаму лбу, які рэзка выдаваўся ўперад, ні моцнаму пераканаўчаму голасу, да якога прыслухоўваліся ўсе прысутныя. З першага погляду нават цяжка паверыць, што ў гэтай маленькай жанчыны столькі энергіі, сілы волі і працаздольнасці.

Упартай работай заваявала сабе аўтарытэт Таццяна Ільінічна. Яе добра ведаюць усе рабочыя і калгаснікі раёна. Яе можна ўбачыць на любым прадпрыемстве, установе, калгасе. З усімі яна пагутарыць, усё даведаецца, дапаможа, калі патрэбна. Кожны ёй, як роднай сястры, свае думкі і патрэбы выкладзе.

Пяць год назад прыехала тав. Якушэва на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат. Працавала парторгам цэха, загадчыкам партабінета, прапагандыстам, намеснікам сакратара парткома.

На вачах выросла яна з малавопытнага кіраўніка гуртка ў добра падрыхтаванага прапагандыста, здольнага партыйнага работніка—сакратара райкома партыі.

Біяграфія Таццяны Ільінічны Якушэвай падобна да біяграфій мільёнаў совецкіх жанчын, вызваленых Вялікай соцыялістычнай рэволюцыяй.

20-гадовай вясковай дзяўчынай яна паступіла ў 1924 г. у рады ленінскага комсамола. Хутка была выбрана сакратаром комсамольскай ячэйкі.

Старыя сяляне, жанчыны, моладзь здалёку віталіся з Таццянай, усе паважалі яе за бадзёрасць, жыццерадаснасць, арганізатарскія здольнасці. Хутка абралі яе членам, а потым старшынёй сельсовета. Яшчэ больш шчыра ўзялася за работу Таццяна. У 1928 г. яна ўступіла ў рады партыі Леніна—Сталіна, той партыі, якая зрабіла яе роўнапраўным чалавекам, заваявала шчасце для ўсяго народа і адкрыла неабмежаваныя магчымасці для росту і росквіту людзей і краіны.

Усюды Таццяна Ільінічна апраўдвала вялікае давер'е партыі і народа. Заўсёды бязлітасна змагалася супроць усіх і ўсякіх ворагаў соцыялістычнай радзімы.

— Буду і надалей верна служыць свайму народу, сваёй большэвіцкай партыі, якая дала мне жыццё, роўнапраўе, шчасце,—заявіла Таццяна Ільінічна Якушэва ў адказ на вылучэнне яе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Бабруйск. **Ф. Канстанцінаў.**

кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР



Фёкла Міхайлаўна Шамко — ордэнаноска—даярка соўгаса „Зарэчча" Смалявіцкага р-на, Жодзінскага сельсовета—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Пліскай выбарчай акрузе.

Александра Міхайлаўна Бахта—стаханаўка-сартыроўшчыца фабрыкі „Х Кастрычнік"—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па 256-й фабрычна-заводскай выбарчай акрузе г. Рэчыцы.

Марыя Апанасьеўна Чэрнышэва—намеснік дырэктара прадзільнай фабрыкі імя К. Маркса—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Лёзнянскай выбарчай акрузе.

ФЁКЛА МІХАЙЛАЎНА ШАМКО

Ордэн „Знак почета" ўпрыгожвае грудзь пажылай, скромнай жанчыны Фёклы Міхайлаўны. Гэта вялікая ўзнагарода атрымана ёю ад совецкага ўрада за адданую стаханаўскую работу па соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Яшчэ на зары разгортвання стаханаўскага руху, на соўгасным сходзе ў былым соўгасе імя Свердлова таварыш Шамко сказала кароткую, але ўпэўненую прамову:

— Мы таксама можам працаваць па-стаханаўску. Для гэтага ў нас маюцца ўсе магчымасці. Неабходна толькі жаданне і адданасць у рабоце.

Не прайшло многа часу, як тав. Шамко свае словы пацвердзіла справай. Ад кароў, за якімі яна даглядала, атрымалі самы высокі ўдой.

У Маскве праходзіла Ўсесаюзная нарада перадавікоў жывёлагадоўлі. Тав. Шамко была выклікана на нараду. Там-жа пастановай ЦВК СССР яна ўзнагароджваецца ордэнам.

Фёкла Міхайлаўна без радаснага хвалявання не можа перадаць пачуцця любві да сваёй радзімы, да вялікага Сталіна, да свайго ўрада. Бо гэту неацэнімую ўзнагароду яна атрымоўвала з рук старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. Калініна, лепшага саратніка т. Леніна—Сталіна, у прысутнасці дарагога, любімага правадыра і друга таварыша Сталіна.

Жыццёвы шлях тав. Шамко—гэта шлях дзесяткаў тысяч беларускіх сялянак. Перанесла яна на сваіх плячах увесь цяжар эксплаатацыі капіталістаў і памешчыкаў. Толькі Совецкая ўлада адкрыла ёй шлях для светлага і радаснага жыцця разам з усімі працоўнымі Беларусі.

Бацька Шамко ў стары час быў спрадвечным батраком у графа Чапскага. Сям'я ў 12 чалавек, а пракарміць трэба. А чым карміць? Выхад быў адзін—ісці ў наймы і як-бы хутчэй паслаць сваіх дзетак сабе на дапамогу, бо галодная смерць пагражала сям'і.

Фёкла Міхайлаўна, будучы яшчэ зусім маленькай дзяўчынкай, паступіла да гэтага-ж графа Чапскага. Так яна працавала да светлых дзён соцыялістычнай рэволюцыі.

Калі зямля Беларусі была ачышчана ад інтэрвентаў, памешчыкаў і графаў і на былым абшары Чапскага арганізавалася соўгасная гаспадарка імя Свердлова, Фёкла Міхайлаўна з першых дзён існавання соўгаса ўступіла ў яго. Там яна папрацавала ў якасці даяркі да дня ліквідацыі. Зараз яна працуе ў соўгасе „Зарэчча", Смалявіцкага раёна.

Яна—дачка нашай радзімы, непрымірыма да ворагаў народа. З першых дзён яе работы ў соўгасе „Зарэчча" яна адчула, што там арудуе варожая рука. Фёкла Міхайлаўна выступіла праз друк, выкрываючы варожую дзейнасць здраднікаў у гэтым соўгасе.

Вялікае давер'е аказалі выбаршчыкі Пліскай акругі і аднадушна вылучылі тав. Шамко кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Яна зарэгістравана і будзе балатыравацца ў гэтай акрузе.

Дачка беларускага народа, выпеставаная і выхаваная вялікай партыяй Леніна—Сталіна, акружаная клопатамі і павагай роднага бацькі таварыша Сталіна, з гонарам будзе насіць імя дэпутата Вярхоўнага Совета БССР і апраўдае вялікае давер'е выбаршчыкаў, якія вылучалі яе і даручаюць ёй ахоўваць інтарэсы працоўных.

Геніна



Еўгенія Саламонаўна Ханіна—дырэктар Віцебскай трыкатажнай фабрыкі „КІМ"—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Вакзальнай выбарчай акрузе г. Віцебска.

Пелагея Астапаўна Якуш—старшыня Рудзенскага райвыканкома—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Смілавіцкай выбарчай акрузе.



Надзежда Грыгор'еўна Грэк—загадчык прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Веткаўскай сельскай выбарчай акрузе.

ЕЎГЕНІЯ САЛАМОНАЎНА ХАНІНА

Васемнаццацігадовай дзяўчынай прышла Геня Ханіна на панчошную фабрыку імя Клары Цэткін. Гэта было ў 1921 г.

Праз некаторы час гэта скромная дзяўчына стала праяўляць сябе як здольная і выдатная работніца. Яна вельмі хутка асвойвала любы працэс і заўсёды была перадавой.

У першы-ж год работы на фабрыцы яна ўступіла ў Ленінскі комсамол, і вось з гэтага часу фабрыка канчаткова ператварылася ў яе дом.

Цяжкія гады перажывала тады маладая краіна Советаў. Становішча на фабрыцы было не важнае: не хапала сыравіны, інструментаў. Памяшканне былога „дворянского собрания", прыстасаванае пад фабрыку, не апальвалася. Новыя слаі рабочых уліваліся ў фабрыку. Неабходна была вялікая агітацыйная работа сярод рабочых. Маладая дзяўчына Еўгенія Саламонаўна ўмела падняць настрой. Заўсёды быў чутны яе голас. Да пачатку работы, у часе абедзенага перапынку вакол яе збіраліся работніцы

— Аднойчы, калі мы, як і звычайна у часе абедзенага перапынку спявалі,—расказвае тав. Слуцкіна,—мы заўважылі, што Геня раптам збялела і пахіснулася. Мы ледзь паспелі яе падтрымаць і яна тут-жа страціла прытомнасць.

Яна нават не прызналася, чым гэта было выклікана. Нарэшце прызналася, што другі дзень нічога не ела. На яе мізэрным заработку ў гэтыя цяжкія гады былі на ўтрыманні маці і малодшая сястра, але ніколі не чулі ад яе скаргі, не бачылі сумнага твару. Заўсёды бадзёрая, жыццерадасная, заўсёды з масай. Словы Еўгеніі Саламонаўны для работніц былі вялікім аўтарытэтам.

— Геня сказала, што трэба правесці суботнік—і ўсе работніцы прыходзілі.

Ішлі гады. Расла і ўмацоўвалася краіна, расла фабрыка імя Клары Цэткін і разам з ёй расла тав. Ханіна.

У 1925 г. ўступае яна ў комуністычную партыю і ў гэтымжа годзе яе абіраюць сакратаром Віцебскага райкома ЛКСМБ.

Затым зноў фабрыка. Старшынёй фабкома, сакратаром парткома і ў 1931 г.—дырэктарам фабрыкі.

Вылучэнне Еўгеніі Саламонаўны дырэктарам—было ўрачыстасцю для ўсёй фабрыкі. Рабочыя ганарыліся тым, што іх выхаванка і любіміца з'яўляецца кіраўніком прадпрыемства. Пяць год працавала яна на гэтай пасадзе. Фабрыка за гады работы тав. Ханінай сістэматычна выконвала вытворчую праграму, узорна была арганізавана тэхнічная вучоба на фабрыцы. У выніку занялі першае месца ў Саюзе; фабрыка атрымала тры пераходных сцягі.

У 1936 г. Наркамат лёгкай прамысловасці прызначае тав. Ханіну дырэктарам Віцебскай трыкатажнай фабрыкі „КІМ".

У гэты час фабрыка не выконвала вытворчай праграмы. Тав. Ханіна мабілізавала калектыў фабрыкі, каб вывесці фабрыку з таго ганебнага прарыва. З чацвертага квартала 1937 г. фабрыка пачала сістэматычна выконваць план. З 1 мая гэтага года фабрыка трымае пераходны сцяг Наркамата і пераходны сцяг горада.

Працоўныя горада Віцебска вылучылі кандыдатуру Еўгеніі Саламонаўны ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Вакзальная акруговая выбарчая камісія горада Віцебска зарэгістравала тав. Ханіну Еўгенію Саламонаўну кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Сваёй нястомнай работай, сваёй адданасцю справе Леніна—Сталіна яна заслужыла вялікі гонар і давер'е выбаршчыкаў. За яе, за дачку радзімы, выбаршчыкі 26 чэрвеня аддадуць свае галасы.

Б. Маршак.

Юлія Канстанцінаўна Харытановіч—старшыня калгаса „III Інтэрнацыянал"—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Асіпавіцкай сельскай выбарчай акрузе.

Марыя Антонаўна Сцяпанава—інжынер-тэхнолаг Аршанскага ільнокамбіната—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Смальянскай выбарчай акрузе № 30.



Екацерына Якаўлеўна Кульба—загадчык малочна-таварнай фермы калгаса імя Леніна—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Менскай сельскай выбарчай акрузе.

ЮЛІЯ КАНСТАНЦІНАЎНА ХАРЫТАНОВІЧ

Чатыры гады назад Юлію Харытановіч упершыню калгаснікі абралі ў кіраўніцтва праўлення калгаса „III Інтэрнацыянал". Цяжка было спачатку працаваць, але цяжкасці яе не палохалі. Арганізавала вакол сябе актыў, уваходзіла ва ўсе дэталі і дробязі калгаснай гаспадаркі, накапляла вопыт. Год за годам Юлія Канстанцінаўна дабівалася ўсё лепшых і лепшых поспехаў. Плады ўпартай, напружанай работы давалі свае станоўчыя вынікі.

Калгас „III Інтэрнацыянал", старшынёй якога з'яўляецца Харытановіч, стаў славіцца сваімі высокімі рэкорднымі ўраджаямі, жывёлагадоўчымі фермамі, садам, ансамблем песень, сваімі людзьмі. А людзі—гэта галоўнае. Гэтага Юлія Канстанцінаўна не забывала, яна сама іх выхоўвала. Звеннявая Марфа Заяц у мінулым годзе са сваімі сяброўкамі Антанінай Беліновіч, Аннай Каральковіч і іншымі атрымала з 1 гектара 808 цэнтнераў цукровых буракоў. Тав. Заяц—член выстаўкома пры Соўнаркоме БССР. Марфа Заяц была членам беларускай дэлегацыі, якая ездзіла вітаць Першую Сесію Вярхоўнага Совета, была ў Крэмлі, бачыла вялікага Сталіна.

Анна Ліпская—даглядчыца на свінаферме. Яна стаханаўка. Тав. Ліпская за мінулы год на працадні з мужам атрымала 90 пудоў зярна, 540 пудоў бульбы. Будучы на раённым злёце стаханаўцаў жывёлагадоўлі, заявіла:

— Я даб'юся, каб ад кожнай свінаматкі атрымаць прыплоду па 22 парасяці.

Свінаферма калгаса адна з лепшых у раёне. За 1937 год чысты прыбытак складаў 9 тысяч руб. Выдатнымі работнікамі ў калгасе з'яўляюцца загадчык жывёлагадоўчай фермы Антон Адынец, брыгадзір Нікалай Беліновіч.

Настаўніка Кучынскага калгаснікі лічаць сваім, блізкім чалавекам. Ён не толькі добра навучае дзяцей. Кучынскі кіруе ансамблем песні і скокаў, які налічвае 40 чалавек. Дзесяткі пастановак, сотні песень, скокаў выканаў ансамбль перад сваімі калгаснікамі суседзямі. Заўсёды вечарамі у калгасным садзе гучаць вясёлыя і шчаслівыя песні.

Любоўю і павагай карыстаецца сярод калгаснікаў ветлівая, сімпатычная, невысокага росту Юлія. Нядаўна ў калгасе адбыўся прадвыбарчы сход. 60-гадовы Нічыпар Новік, стаханавец калгаса, папрасіў слова.

— Аб такім жыцці, якое наступіла цяпер, я нават не снiў,— гаварыў ён.—Праца ад цямна да цямна, бізун, скарынка чорствага хлеба і бульба,—вось што я ведаў раней. А зараз жыццё наступіла такое, што толькі і жыць хочацца. Шчасце і радасць даў нам вялікі і мудры Сталін. Вось таму Сталіна я і вылучаю першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я таксама прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты нашу Юлю. Гэта яна вывела наш калгас у перадавыя, пабудавала клуб, набыла радыё, тэлефон.

Прапанову старыка Новіка падтрымалі не толькі ў калгасе „III Інтэрнацыянал", а ўсе працоўныя Асіпавіцкай сельскай выбарчай акругі.

Тав. Харытановіч нарадзілася ў сялянскай сям'і. З 1927 г. яна актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Была абрана членам сельсовета. Юлія адна з першых у 1929 г. паступае ў калгас. Неўзабаве ёй даручылі кіраваць рэвізійнай камісіяй, а потым абралі старшынёй калгаса.

Скромная, энергічная, 35-гадовая беспартыйная Юлія Харытановіч—адна з многіх дзесяткаў тысяч жанчын нашай радзімы. Яе выхавала партыя, совецкая ўлада. За адданую і верную дачку радзімы Юлію Канстанцінаўну Харытановіч аддадуць свае галасы выбаршчыкі.

Сергеенка.

Праскоўя Канстанцінаўна Ціханская—ордэнаносец калгаса „Чырвоныя Еромкавічы"—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Еромкавіцкай выбарчай акрузе № 31.



Ольга Канстанцінаўна Шарко—камбайнерка Самахвалавіцкай МТС—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Самахвалавіцкай сельскай выбарчай акрузе.



Марыя Міхайлаўна Баранава—старшыня Акішынскага сельсовета—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Свяцілавіцкай выбарчай акрузе.

ПРАСКОЎЯ КАНСТАНЦІНАЎНА ЦІХАНСКАЯ

У хаце ажыўлена. Віншуюць Праскоўю Канстанцінаўну з новай і вялікай падзеяй у яе жыцці.

— Шчасце безумоўна неперадаваемае,—гаворыць Праскоўя Канстанцінаўна.—Але ў нас усе людзі шчаслівыя. І калі некаторыя ў дзяцінстве пакутвалі, то зараз зажылі поўнакроўным жыццём совецкага грамадзяніна. У краіне квітнеючага соцыялізма не адчуваецца розніцы паміж старымі і маладымі.

Праскоўі Канстанцінаўне 43 гады. 23 гады былі для яе пакутамі. Хіба-ж гэта было падобна на жыццё, калі хлеба чорнага нехапала. У бацькі Праскоўі Канстанцінаўны было 9 душ сям'і, і што толькі не прыходзілася рабіць сям'і, каб пракарміць сябе. З малых год дзеці пайшлі ў наймы да кулакоў за нянек, за пастухоў. Бацька Канстанцін доўгія гады перад рэволюцыяй пастухом быў, і за імі, яшчэ надоўга засталася назва „дзеці пастуха".

Праскоўя Канстанцінаўна часта думала чаму яе называюць пастушкай, а другіх Іванамі Нікітавічамі ды Валенцінамі Валентавічамі. Адказу нідзе не знаходзіла. Толькі пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, калі ўсе Іваны Нікітавічы і Валенціны Валентовічы былі знішчаны, а праца для людзей стала справай гонару, доблесці і геройства, Праскоўя і сама зразумела, што дзеці пастуха, „пастушка" не ёсць абраза, а што ў нашай краіне любая прафесія з'яўляецца павагай і гонарам для людзей.

Былую пастушку зараз у калгасе „Чырвоныя Еромкавічы" інакш не называюць, як Праскоўя Канстанцінаўна.

Такой павагай яна карыстаецца сярод калгаснікаў заслужана стараннай работай у калектыўнай гаспадарцы.

Сям'я Ціханскай Праскоўі з першага дня калектывізацыі ўступіла ў калгас „Чырвоныя Еромкавічы". Яна ўсе сілы пакладала, каб арганізаваць і ўмацоўваць свой калгас.

У 1937 г. яна ўзяла на сябе абавязак дабіцца з усёй плошчы ільна па 4,9 цэнтнера з гектара, і гэтага дабілася з перавыкананнем. Адначасова яна ўзяла сабе рэкордны ўчастак і дабілася са сваім звяном з кожнага гектара па 10 цэнтнераў ільнавалакна 22 нумарам.

1936 г. у жыцці Праскоўі Канстанцінаўны з'яўляецца самым знамянальным годам. З таго часу на яе грудзях ззяе ордэн „Знак почета".

У калгасы Аршанскага раёна прыслалі ільнатрапальную машыну „Антонава". Неўзабаве прывезлі гэту складаную машыну і ў калгас „Чырвоныя Еромкавічы". У калгасе не аказалася людзей, якія-б маглі працаваць на машыне. Некаторыя калгаснікі падаліся антымеханізатарскім настроям, гаварылі, што трэба адправіць машыну з калгаса. Але тут, як і заўсёды, Праскоўя прышла на дапамогу. Яна выступіла супроць такіх настрояў і прапанавала асвоіць тэхніку складанай машыны. Узяла самую складаную аперацыю—падавальшчыцы. Першы дзень поспехі былі нязначныя, але праз некалькі дзён пры актыўным удзеле тав. Ціханскай на машыне „Антонава" былі выпрацаваны самыя высокія паказчыкі. Рэкорд быў заваёван усебеларускі. І вось за гэта тав. Ціханскую на Усесаюзнай нарадзе перадавікоў ільна ўзнагародзілі ордэнам „Знак почета".

У гэтым годзе яна перажывае другую радасць і шчаслівую падзею ў яе жыцці. Выбаршчыкі Еромкавіцкай выбарчай акругі вылучылі яе сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай рэспублікі.

За гэта шчасце, за вялікае давер'е, якое аказалі ёй выбаршчыкі Еромкавіцкай выбарчай акругі тав. Ціханская адкажа сваёй пачэснай працай, як падабае абранніку вялікага народа.

Н. Старавойтава.

Аршанскі раён.

XVII З'езд большэвікоў Беларусі

На працягу 8 дзён праходзіў з'езд большэвікоў Беларусі. З'езд падвёў вынікі вялікай і ўпартай работы, праробленай КП(б)Б пад кіраўніцтвам Сталінскага ЦК ВКП(б) і правадыра народаў любімага Сталіна за час з XVI па XVII з'езд, і наметіў далейшую праграму дзеянняў па выкананню задач, пастаўленых перад КП(б)Б Цэнтральным Камітэтам ВКП(б).

Прайшоўшы год з часу XVI з'езда комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі быў годам велізарнейшых падзей.

Большэвікі Беларусі пад непасрэдным кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта і прамым удзеле вялікага Сталіна разгромілі і выкарчавалі здрадніцкія гнёзды ворагаў народа—трацкісцка-бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх, шкодніцкіх германа-польскіх шпіёнаў, якія на працягу доўгага часу арудвалі ў Беларусі.

За прайшоўшы год Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка дабілася вялікіх поспехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Наша Беларусь дзякуючы клопатам таварыша Сталіна і дзякуючы правільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ператварылася ў індустрыяльную рэспубліку, у рэспубліку буйнай сельскай гаспадаркі і квітнеючай соцыялістычнай культуры.

Адбыўшыйся з'езд КП(б)Б паказаў, што большэвікі Беларусі ідэйна згуртаваны вакол Сталінскага ЦК ВКП(б) і свайго друга і правадыра таварыша Сталіна.

Большэвікі Беларусі, узброіўшыся рашэннем люцтаўска-сакавіцкага пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна, бязлітасна громячы асіныя гнёзды здраднікаў народа, бухарынска-трацкісцкіх шпіёнаў, шкоднікаў і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, яшчэ больш узбройвалі сваю большэвіцкую пільнасць, умацоўвалі сувязь з масамі, змагаліся за ўздым нашай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва.

Бязлітасна громячы ворагаў народа, партыя большэвікоў Беларусі прарабілі вялікую работу па вылучэнню новых кадраў на ўсе ўчасткі соцыялістычнага будаўніцтва. Да кіраўніцтва заводаў, прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў і ўстаноў прышлі новыя здольныя людзі, якія на справе даказваюць сваю беззаветную адданасць партыі Леніна—Сталіна і, не шкадуючы сваіх сіл, змагаюцца за ажыццяўленне пастаўленых перад імі задач Цэнтральным Камітэтам нашай партыі і таварышам Сталіным.

Непазнавальнай стала наша прамысловасць у параўнанні з мінулым. БССР стала рэспублікай буйнай прамысловасці. Удзельная вага прадукцыі соцыялістычнай прамысловасці ва ўсёй народнай гаспадарцы займае 73 проц. Прамысловасць БССР толькі за 1937 год выпусціла прадукцыі на 2 100 мільёнаў рублёў. Гэта значыць, што наша прамысловасць ў параўнанні з 1913 годам выросла ў 21 раз. Вось якія карэнныя змены адбыліся ў эканоміцы БССР.

Сельская гаспадарка Беларусі, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і пры штодзённых клопатах таварыша Сталіна развіваецца шпаркімі тэмпамі. На калгасных палях рэспублікі ў гэтым годзе працуе 8141 трактар, 1214 камбайнаў, 1374 ільноцерабілак, 2381 трактарных малацілак, 1183 аўтамашыны і некалькі сот другіх складаных сельскагаспадарчых машын.

Развіваецца культура Беларусі, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу. Дзесяткі тысяч вучняў, студэнтаў вучацца на сваёй роднай мове ў школах, тэхнікумах і ВНУ, якія пабудаваны за годы соцыялістычнай рэволюцыі.

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР і падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР паказалі маральнае і палітычнае адзінства беларускага народа, яго беззаветную адданасць партыі і таварышу Сталіну.

Аднак было-б зусім няправільна заспакайвацца на дасягнутых поспехах. Большэвікі Беларусі не павінны ні на мінуту забываць, што мы жывем і знаходзімся на рубяжы з капіталістычнымі краінамі. Фашысты ўсімі мерамі стараюцца засылаць да нас сваю агентуру для шпіянажа, дыверсый і шкодніцкай дзейнасці.

Таму большэвіцкая пільнасць павінна быць неад'емнай часткай кожнага члена і кандыдата партыі. Трэба цвёрда памятаць, што ворагі народа разбіты, але канчаткова не знішчаны. Яны стараюцца захавацца ў глыбокае падполле і, карыстаючыся расхлябанасцю і паслабленнем пільнасці некаторых таварышоў, наносяць вялікую шкоду нашаму соцыялістычнаму будаўніцтву.

Нельга мірыцца з такім становішчам, што многія галіны нашай прамысловасці не выконваюць вытворчых планаў. Заданне па зніжэнню сабекошту, павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі таксама не выконваецца значнай часткай прамысловасці.

Ворагі народа, арудваўшыя ў апараце Наркамзема і ў нізавой сістэме, многа нашкодзілі сельскай гаспадарцы. Аднак ліквідацыя вынікаў шкодніцтва ідзе марудна. Многія зямельныя органы, партыйныя і совецкія арганізацыі ўшчыльную не ўзяліся за поўнае і бязлітаснае выкарчоўванне шкодніцтва ў гэтай важнай галіне народнай гаспадаркі.

Таксама марудна ідзе ліквідацыя рэшткаў шкодніцтва і ў галіне аховы здароўя працоўных і на фронце культурнага будаўніцтва. Наркамздраў і Наркамасветы карэнным чынам не прыступілі к ліквідацыі рэшткаў шкодніцтва ў іх сістэме.

Вялікая работа партыйнымі і совецкімі арганізацыямі праробліна па вылучэнню новых кадраў. Аднак вылучэнне жаночых кадраў застаецца да гэтага часу слабым месцам у іх рабоце. Ні чым іншым, як ігнараваннем важнейшых дырэктыў партыі можна лічыць такі факт, калі з агульнага ліку вылучаных на адказнейшыя работы вылучэнак-жанчын налічваецца ўсяго 6 проц. Вылучэнне прайшло выключна на нізавыя работы калгасаў і сельсоветаў. Задача партыйных арганізацый—зрабіць рашучы пералом па вылучэнню жанчын на адказныя работы. Смялей вылучаць жанчын, штодзённа іх выхоўваць—з'яўляецца неадкладнай справай і гонарам партыйных і совецкіх арганізацый.

Партыйныя арганізацыі Беларусі, узброіўшыся рашэннем XVII З'езда КП(б)Б, па-большэвіцку возьмуцца за іх выкананне і ўсе недахопы і прабелы, якія маюцца ў рабоце КП(б)Б, будуць знішчаны ў самы кароткі час.

Успамінаюць пра сваё цяжкае мінулае

АБ МІНУЛЫМ

Пражыла я на свеце ўжо не мала—65 год, а таму і расказаць ёсць аб чым. Гляджу я на маладых і проста слёзы радасці льюцца з вачэй. Усе добра апрануты, у бацінках, сукенках шоўкавых, многа нават з партфелямі, а я ў суровай саматканай кашулі ў школу хадзіла. У школу ўсяго тры зімы пахадзіла, а больш не змагла—працаваць патрэбна было, бацькам дапамагаць.

Не лепш жылося, як і замуж вышла. Сталі дзеці. Прыходзілася дзень і ноч працаваць, каб на хлеб зарабіць, сябе і дзетак пракарміць і апрануць.

Муж працаваў на чыгунцы, не памятаю добра колькі яму плацілі,—ці 10, ці 15 рублёў у месяц. Мы яшчэ ў старыя часы пераехалі ў Жлобін працаваць. Жлобін тады быў зусім не такі, некалькі хат стаяла, а кругом лес рос. Гэта за гады совецкай улады новыя вялікія дамы пабудаваны, вуліцы брукаваныя сталі, дзе толькі тое балота дзелася.

У мяне ўжо тады восем дзяцей было. Пераехала, а на кватэру ніхто і не пускае—сям'я, кажуць, вялікая. Усе хаты абхадзіла, нарэшце адны згадзіліся. „Пераходзьце да мяне, можа як памесцімся". Гляджу я, пакойчык малы, а ў яе сем душ сваёй сям'і, ды ў мяне дзесяць. Але нічога не зробіш, прышлося пасяліцца. Так і жылі, гаравалі.

Совецкая ўлада адкрыла вялікі светлы шлях нашаму жыццю. Зараз усе мае дзеці выраслі. Жывуць добра. Адна дачка і сын у Ленінградзе на заводзе працуюць. Астатнія тут жывуць. Усе стахановцы, адукаваныя.

А пра выбары пры цары наогул нічога не магу сказаць. Я тады ніколі нікога не выбірала і ні за кога не галасавала. Мы, жанчыны, такога права раней не мелі. Гэта маглі выбіраць толькі мужчыны, ды і то багатыя. Мой муж мала хадзіў на сходы, яму не заўсёды дазвалялася.

Толькі пры совецкай уладзе, калі мы ўжо сталі роўнапраўнымі, я на сходы хаджу, удзельнічаю ў выбарах. Вось нядаўна Вярхоўны Совет выбірала. Галасавала за людзей, якія змагаюцца, каб нам так добра і радасна жылося.

26 чэрвеня будзем выбіраць вярхоўны орган улады нашай Беларускай рэспублікі. Тады я таксама аддам свой голас за лепшых сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы.

Глушак Хрысціна Майсееўна.

Тав. Карнос Л. (63 гады) прэміравана БРК саюза кінофотаработнікаў за актыўны ўдзел у грамадскай рабоце і за паспяховую ліквідацыю сваёй непісьменнасці.

САМЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ ВЫБАРЫ Ў СВЕЦЕ

Раней пры цары мы, жанчы не ведалі, як выбіраць і каго. Н і блізка не дапускалі да таго ме

Ведалі, што перад выбарамі се скага старасты нашы мужчы хадзілі некалькі дзён п'яны выбіралі без іх каго хацелі. Па выбараў толькі даведваліся к абралі. Зараз выбары зусім нел параўноўваць з мінулымі. У вы рах нашай дзяржаўнай совец улады ўдзельнічаюць усе. насельніцтва задоўга да выба ведае каго будзе выбіраць, ве свайго кандыдата.

Я разам з усімі 12 снежня га савала за лепшых прадстаўні народа ў Вярхоўны Совет СС Гэты дзень быў урачыстым д у нашым жыцці. Зараз рыхту разам з усімі да другога знамяна нага дня—выбараў вярхоўнай ул нашай Совецкай Беларусі. Я ведваю гурток пры калгасе. Ув ліва слухаю дакладчыка. Заня мне вельмі падабаюцца.

Мяне ўжо ніхто не саб'е з тол Я навучылася, магу даць ад ворагу, калі ён паспрабуе перашкодзіць.

Калгас „Комуна"
Стара-Дароскі раён.

Карапе

ЗА ВЯЛІКАГА СТАЛІНА

Цяперашняе жыццё нельга ні ў якім разе параўнаць з мінулым.

Дзяцей у мяне было сямёра. Як толькі падраслі, пайшлі па кулаках працаваць за кавалак хлеба. Але нічога нельга было зрабіць. Мы былі бедныя і да нас нікому не было справы,—так жылося ў старыя часы.

Зараз мы, старыя, жывем зусім інакш. Радуемся гледзячы на сваіх дзяцей, перад якімі адкрыты шырокія дарогі. Калі гэта магло быць раней, каб дзеці бедняка-селяніна маглі вучыцца, быць настаўнікамі! Ніколі аб гэтым і думаць нельга было. А зараз мая дачка Наташа працуе настаўніцай, сын Ваня—загадчык дома соцкультуры, а Грыша—комсорг. Усе яны ў мяне адукаваныя, і сэрца хвалюецца, калі я гляджу на іх шчаслівае жыццё. А ці-ж гэта ўсё? Не, гэта толькі пачатак. Яны яшчэ маладыя. І іх жыццё ўсё больш і больш будзе працвітаць.

Набліжаецца дзень выбараў Вярхоўны Совет БССР. Што і заць—радасны дзень у наш жыцці. Да гэтага дня мы ўсе р туемся, бо ў гэты дзень буд выбіраць сваю дзяржаўную ўла будзем выбіраць тых, каго добра ведаем. Ад нас не зах ваюць, каго будзем выбіраць. доўга да выбараў мы ведаем падрабязнасці аб нашых канды тах. Гэта не тое, што ў стары Тады ўлада была не наша, а мешчыкаў і кулакоў. Эксплаа тары выбіралі таго, хто ім пат бен, а не нам. Да нашага гол не прыслухоўваліся.

У дзень выбараў—26 чэрвен я буду галасаваць за лепшых дзей нашай радзімы, буду гала ваць за Сталіна, за партыю, шчасце сваіх дзяцей, за шча ўсіх нас.

Фядора Карале

Стара-Дароскі раён,
калгас „Комуна"

РАСКАЗВАЮЦЬ АБ СВАІМ РАДАСНЫМ І СВЕТЛЫМ СУЧАСНЫМ

СТАЛІН НАША СОНЦА

Мне 18 год. У надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет БССР я першы раз буду мець права ўдзельнічаць у выбарах. Я вельмі рада, што змагу ўпершыню аддаць свой голас за лепшых людзей нашай бацькаўшчыны. Свой голас аддам таму, хто стварыў нам шчаслівае, культурнае жыццё, хто шырака адкрыў шлях ва ўсе навучальныя ўстановы для совецкай моладзі.

Я маладая. Нарадзілася і выросла пры совецкай уладзе. Маё жыццё зусім розніцца ад жыцця Хрысціны Мейсееўны, якая расказала пра мінулае яе жыццё на сустрэчы дзяцей пакаленняў. Слухала я яе ўважліва і думала, як карысна ведаць пра мінулае жыццё нашых бацькоў і бабулек, каб можна было расказаць яшчэ маладзейшым, як экваўся над рабочымі і сялянамі пан, буржуй, пан і падпанак.

Я жыву ў Сталінскую эпоху, калі ідзе росквіт не толькі культуры, але і ўсяго чалавецтва, калі нас клапоціцца совецкі ўрад і сабліва таварыш Сталін. Таварыш Сталін—лепшы друг дзетвары і школьнікаў, ён з'яўляецца нашым бацам.

Я вучуся ў 9 класе. Вучуся добра. З'яўляюся членам ленінскага камсамола. Пярвічная арганізацыя даручыла мне кіраваць пачэснай управай. Я піонерважатая 5-га класа.

Перада мной стаіць адказная задача—вывесці свой атрад у пераднія па падрыхтоўцы і правядзенню іспытаў. Гэтага я дабіваюся і дабіюся. Мне ў гэтым дапаможа актыў атрада.

Як я, так і піонеры майго атрада гатыя на сябе абавязацельствы выканаем з гонарам. Тым больш мне абавязвае тое, што я буду першыню удзельнічаць у выбарах нашага беларускага парламента на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі.

Дзякуй роднаму бацьку таварышу Сталіну за шчаслівае дзяцінства!

Рыва Ізраілеўна Шляфер

Лобін.



Парад фізкультурнікаў на Віцебскім гарадскім стадыёне.
Фота Почкаева (СФ).

БУДУ ГАЛАСАВАЦЬ ПЕРШЫ РАЗ

Аб бяспраўным і паднявольным жыцці нашых бацькоў я ведаю з расказаў. Я нарадзілася ў шчаслівую эпоху, у якой і жыву. Перад намі адчынены шырокія перспектывы, мы роўнапраўныя грамадзяне. У Сталінскай Канстытуцыі запісаны залатымі словамі нашы вялікія правы. СССР—адзіная краіна ў свеце, у якой моладзі так добра жывецца.

Мы ведаем, пад якім гнётам жыве зараз моладзь капіталістычных краін. Бяспраўе, беспрацоўе і бесперспектыўнасць—такі шлях іх.

Моладзь совецкай краіны любіць і цэніць сваю радзіму, гатова за яе аддаць сваё жыццё, калі гэта патрэбна будзе. Мы ў 18 год ужо можам выбіраць і быць абранымі. Мы вельмі ганарымся гэтым. За такое радаснае жыццё і вялікія правы мы абавязаны нашай камуністычнай партыі, дарагому і любімаму правадыру т. Сталіну.

Пасля апублікавання пастановы ўрада аб дні выбараў у Вярхоўны Совет БССР, мы яшчэ больш упарта пачалі рыхтавацца да дня выбараў, каб гэты дзень сустрэць, як самае ўрачыстае свята нашага жыцця. Я выбіраць буду ўпершыню, і таму я да гэтага дня рыхтуюся з асаблівай радасцю. Я наведваю гурток па вывучэнню „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР". Многа чытаю літаратуры аб выбарах.

Падрыхтоўку да выбараў мы павінны спалучыць з работай на калгаснай вытворчасці. Я працую на свінаферме калгаса. Вучастак работы даволі адказны і ганаровы. Я гэта ўсё ўяўляю сабе добра і пастараюся дабіцца добрых паказчыкаў у сваёй рабоце.

Буду працаваць яшчэ лепш, яшчэ адданей на карысць нашай радзімы. Буду арганізоўваць сваіх падруг на стаханаўскую работу.

Сакава Т.

Стара-Дароскі раён, калгас „Комуна"

26 чэрвеня аддадзім свае галасы за лепшых сыноў і дачок нашай радзімы!

Жанчыны Прамысловай выбарчай акругі кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага

ЗВАРОТ

ДА ЎСІХ ВЫБАРШЧЫКАЎ ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ СТАЛІНСКАГА РАЁНА, ДА ЎСІХ ЖАНЧЫН-ВЫБАРШЧЫКАЎ гор. МЕНСКА

Дарагія таварышы!

Сход жанчын выбаршчыкаў Прамысловай выбарчай акругі Сталінскага раёна гор. Менска сабраўся ў выключна радасныя дні, каб падзяліцца сваім глыбокім пачуццём любві да сваёй радзімы, да ленінска-сталінскай партыі, да нашага роднага і любімага таварыша Сталіна.

Роўна праз дванаццаць дзён—26 чэрвеня беларускі народ будзе выбіраць свой соцыялістычны парламент Беларусі.

На долю выбаршчыкаў Прамысловай выбарчай акругі выпаў велізарнейшы гонар і радасць. Па нашай акрузе балатыруецца любімы і дарагі правадыр народаў **Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.** Аказанае нам найвялікшае давер'е мы павінны з гонарам апраўдаць.

Сход жанчын заклікае выбаршчыкаў Прамысловай выбарчай акругі галасаваць за таго, хто ясны і пэўны, як Ленін,—за рулявога краіны соцыялізма таварыша **Сталіна;** хто так бясстрашны ў баі і бязлітасны да ворагаў народа, як Ленін,—за машыніста лакаматыва рэволюцыі таварыша **Сталіна;** хто таксама вольны ад усякага падабенства панікі, як быў вольны Ленін,—за генія чалавецтва таварыша **Сталіна;** хто таксама мудры і не паспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, як Ленін,—за сцяганосца соцыялістычнай рэволюцыі таварыша **Сталіна;** хто таксама праўдзівы і чэсны, як Ленін,—за мудрага друга і настаўніка таварыша **Сталіна;** хто таксама любіць свой народ, як любіў яго Ленін,—за нашага першага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вялікага Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна.**

У гэты дзень выбаршчыкі Прамысловай выбарчай акругі павінны яшчэ раз прадэманстраваць несакрушальнае маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа, магутнасць і блеск соцыялістычнай дэмакратыі.

Сход жанчын заклікае выбаршчыкаў Молатаўскай выбарчай акругі горада Менска аддаць свае галасы за вернага саратніка вялікага Сталіна, жалезнага наркома абароны, нашага дэпутата ў Вярхоўны Совет СССР, за Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Сход жанчын заклікае выбаршчыкаў Дзержынскай выбарчай акругі горада Менска галасаваць за бліжэйшага саратніка роднага і любімага Сталіна, главу совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

Сход жанчын заклікае ўсіх жанчын выбаршчыкаў горада Менска галасаваць за кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за лепшых сыноў і дачок нашай радзімы, за кандыдатаў, якія да канца адданы справе Леніна–Сталіна, за людзей, якія бязлітасны да ворагаў народа, якія ўсё сваё жыццё аддаюць за справу перамогі комунізма.

Заклікаем вас, жанчын, у дзень 26 чэрвеня прыйсці на выбарчыя ўчасткі і выканаць свой высокі грамадзянскі абавязак—аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Усе на выбары ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР!

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве наш першы кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, наш родны друг і настаўнік **Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!**

Гор. Менск, 14 чэрвеня 1938 г.

Прамова хатняй гаспадыні тав. Мышленак

Дарагія таварышы жанчыны!

На нашу долю выпала велізарнае, ні з чым непараўнальнае шчасце—па нашай выбарчай акрузе ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР будзе балатыравацца наш родны друг і бацька Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. (Апладысменты).

Наш любімы правадыр, самы вялікі з людзей, друг усіх працоўных, наш родны Сталін, які штодзённа клапаціцца аб нас, які даў нам наша шчаслівае жыццё, будзе нашым дэпутатам.

26 чэрвеня будзе адным з самых шчаслівых дзён у маім жыцці.

Дарагія таварышы жанчыны! Я заклікаю вас аддаць свае галасы, за таго, хто, не шкадуючы свайго жыцця, вядзе нас ад перамогі да перамогі, за таго, хто даў нам радаснае жыццё—за Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. (Апладысменты).

Няхай яшчэ доўгія і доўгія годы жыве наш родны друг таварыш Сталін! Няхай жыве ён на радасць працоўным, на страх ворагам!

Я з радасцю і гордасцю аддам свой голас за лепшага з лепшых, за мудрага з мудрых Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. (Апладысменты).

выражаюць сваю любоў і адданасць свайму Совета БССР Вялікаму СТАЛІНУ

Прамова навуковага работніка А. Фіглоўскай

Бязмежна радасць беларускага народа, якому выпала велізарнае шчасце зарэгістраваць сваім першым кандыдатам у соцыялістычны парламент рэспублікі Вялікага машыніста рэволюцыі—гордасць, мару і надзею ўсяго перадавога, прагрэсіўнага чалавецтва—Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Бязмежна радасць беларускага народа, які ўдастоіўся гонару галасаваць 26 чэрвеня за лепшых з лепшых людзей краіны, за верных і бліжэйшых саратнікаў вялікага Сталіна—тт. Молатава, Варашылава, Ежова, Кагановіча, Калініна, Мікаяна, Андрэева і Жданава.

Гэта абавязвае нас яшчэ лепш працаваць, быць дастойнымі радзімы соцыялізма. Для нас, для нашага шчасця змагаліся вякамі перадавыя людзі свайго часу. Для нас таміліся і гінулі лепшыя людзі краіны ў царскіх турмах і казематах; для нас, для нашага шчасця паміралі людзі на франтах грамадзянскай вайны.

Далёка ззаду дні праклятага мінулага, калі змучаны, хворы беларус, прыніжаны да нечалавечага стану, бязлітасна эксплаатаваўся на капіталістычных фабрыках, паліваў сваім потам і крывёю памешчыцкія і кулацкія землі. Зніклі назаўсёды чорныя годы, калі беларускі народ стагнаў у ланцугах ганебнага рабства і прыгнечання.

Толькі Вялікі Кастрычнік назаўсёды разбіў аковы рабства, разняволіў беларускі народ, як і другія народы нашай соцыялістычнай краіны.

Пышна расцвіла культура, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу. Совецкая Беларусь з'яўляецца рэспублікай суцэльнай пісьменнасці, а да рэволюцыі 75 проц. насельніцтва было непісьменным. У гэтым годзе ў нас працавалі 7032 школы, у якіх навучалася 1012928 дзяцей. Калі да рэволюцыі ў нас не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, то зараз мы маем Акадэмію Навук, 23 навукова-даследчых інстытута, 22 ВНУ, у якіх навучаецца 14626 студэнтаў. Усе гэтая факты ярка сведчаць аб росквіце совецкай культуры і навукі. Перад людзьмі навукі ў краіне Советаў адкрыты такія неабсяжныя магчымасці, якіх ніколі не было і няма ні ў адной краіне свету.

Тая выключная ўвага, якую аказвае людзям самай перадавой навукі ў свеце партыя большэвікоў, совецкі ўрад і асабіста тав. Сталін,—робяць нашу працу яшчэ больш радаснай і мэтаімкнёнай.

Бліскучым прыкладам сувязі навукі з жыццём, тэорыі з практыкай паказвае сам таварыш Сталін. Гэта ён, велізарнейшы муж навукі, бясстрашны рэволюцыянер думкі, распрацаваў тэорыю соцыялістычнага будаўніцтва і ператварыў яе ў жыццё ў нашай краіне.

Вогненныя словы таварыша Сталіна і тав. Молатава ўліваюць у сэрцы совецкіх настаўнікаў і ўсіх працоўных бадзёрасць і натхненне яшчэ лепш працаваць для шчасця народа, на дабро любімай соцыялістычнай радзімы.

Мы, выбаршчыкі Прамысловай выбарчай акругі, павінны праявіць яшчэ больш магутную арганізаванасць і згуртаванасць. Мы павінны цвёрда памятаць, што мы галасуем за правадыра ўсяго перадавога чалавецтва, за вялікага тварца самай дэмакратычнай у свеце совецкай Канстытуцыі—Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Мы 26 чэрвеня аддадзім свае галасы за генія чалавецтва, сонечнага правадыра ўсіх народаў любімага, роднага Вялікага Сталіна.

„... Цвети наша родина, край,
как мечта, золотой
И зорче глядите орлы, охраняя
границы.
За счастье—наш голос, за правду,
за солнечный свет,
За братство народов, за меч
нержавеющей стали.
Пусть первым войдет от народов в Верховный Совет
Родной и любимый, великий и
солнечный СТАЛИН."

Прамова 60-гадовай хатняй гаспадыні тав. Астрэйка

Шчаслівым жыццём жыве цяпер беларускі народ. Кожны з нас адчувае гэта кіпучае і радаснае жыццё. Асабліва яго адчуваюць людзі такога ўзроста, як я—старыя, якім прышлося перажыць прыгнёт мінулага. Якіх дзяцінства і юнацтва прайшлі ў наймах у кулакоў, паноў і буржуяў, у якіх не адзін раз была збіта спіна бізунамі.

Зараз мы жывем у сталінскія дні. Мы гаспадары ўсяго багацця вялікага, неабдымнага Совецкага Саюза.

Колькі ў нас прыгожых сталінскіх школ, колькі вышэйшых навучальных устаноў, а ў іх вучацца мільёны нашых дзяцей. Яны растуць і выхоўваюцца ў нашыя светлыя і радасныя дні, у Сталінскую эпоху. Аб іх па-бацькоўску клапоціцца комуністычная партыя, совецкі ўрад і родны таварыш Сталін. (Апладысменты).

Я сама непісьменная, а вучыцца мне так хацелася. Для мяне гэта было толькі марай, таму што бацькі былі беднякамі. Лёс маіх дзяцей зусім другі. Малодшы сын Эдуард ў Маскве ў Ваеннай Акадэміі вучыцца, у гэтым годзе ўжо будзе лётчыкам. Старшы сын працуе ў ЦК МОПР.

Мы шчаслівыя, што з'яўляемся членамі вялікай сям'і краіны Советаў. Вось чаму мы ганарымся і бязмежна рады, што родны бацька, друг і настаўнік, любімы геній чалавецтва вялікі Сталін будзе балатыравацца па нашай Прамысловай выбарчай акрузе, і што на нашу долю выпала вялікае давер'е і гонар—галасаваць за самага лепшага чалавека ў свеце, за кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета ордэнаноснай Беларускай рэспублікі таварыша Сталіна (Апладысменты).

Анна Іосіфаўна Акулёнак—работніца Магілёўскай швейнай фабрыкі—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе г. Магілёва.



Зінаіда Сцяпанаўна Мельнікава—старшыня Нова-Малыніцкага сельсовета — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Чачэрскай сельскай выбарчай акрузе № 243.



Ніна Грыгор'еўна Стасенко—інжынер завода імя Халтурына—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Рагачоўскай сельскай выбарчай акрузе № 237.

КЛАЎДЗІЯ АМОСАЎНА АБУШЭНКА

Аб яе жыцці можна было-б скласці сказ, красачны, праўдзівы, аб тым, як у краіне соцыялізма пастушка робіцца дзяржаўным дзеячом. І гэты сказ быў-бы не аб адным чалавеку, якому ў жыцці спадарожнічала ўдача, не,—гэта быў-бы народны расказ аб дзесятках тысяч такіх-жа, як яна, адданых дачок совецкай краіны, вырашчаных і ўзнятых на вышыню нашай слаўнай большэвіцкай партыяй.

Клаўдзія Абушэнка зарэгістравана па Заслаўльскай сельскай акрузе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Яна належыць да маладога пакалення нашай радзімы. Радасна глядзець на гэту бадзёрую, энергічную жанчыну-большэвічку, у кожным руху якой, у кожным слове сказваецца вялікая воля і вытрымка.

Клаўдзіі было дзесяць год, калі петраградскія большэвікі, кіруемыя Леніным і Сталіным, назаўсёды ўзнялі слаўны кастрычніцкі сцяг. Дайшлі весткі аб гэтай доўгачаканай радасці і ў глухую, закінутую вёску Гародна, Расонскага раёна.

У ліку тых, хто расцвёў ад гэтай весткі і быццам памаладзеў, быў і бацька Клаўдзіі—Амос Абушэнка. Спрадвечны гаротнік, ён хаця і працаваў ад зары да захада сонца, але жыць было вельмі цяжка. Ці жарты—восем душ сям'і, мал-мала менш, а зямлі кавалачак, мізэрная кароўка. І таму ўся сям'я, уключаючы і маці, ішлі ў наймы. У пакасіўшайся непрыглядная хатцы Абушэнка, пакрытай саламяным дахам, заўсёды голадна, заўсёды холадна. Клаўдзію отдалі ў наймы.

Клаўдзія і раней не прывыкла песціцца ў ложку, не даводзілася, а тут яшчэ цёмна на двары, яшчэ зоркі не згаслі на небе, а дзяўчынка ўжо на нагах. Цяжэй за ўсё зімой. Сон скоўвае вочы, не павярнуцца, не шалахнуцца-б, а тут уставай ледзь свет і спяшайся на гаспадарскі двор.

У гарачы летні дзень, калі на полі замiраючая цішыня і кругом ні жывой душы, добра марыць. І тады ў дзяўчынкі ўзнікаюць дакучлівыя думкі—чаму адны жывуць багата, а другія бедна? Прабавала яна з гэтым пытаннем падыйсці да бацькі, а ён задумліва паглядзеў на дачку і прамаўчаў. Што адкажаш?!

Жыццё само адказала ёй на гэта пытанне, адказала праўдзіва, і Клаўдзія шчасліва тым, што адказ у яе карысць.

У дзяўчыны, пачаўшай свядома пераживаць акружаючае, узніклі новыя глыбокія інтарэсы. Яе цягнула да кнігі, ёй хацелася вучыцца. Тады яна ўступіла ў комсамол. Ці можна забыць вясковыя комсамольскія сходы?! Якія толькі пытанні не ўзнімаюцца на іх! Клаўдзія кіруе комсамольскімі справамі. У ёй адчуваецца добры арганізатар, чулы, клапатлівы, адданы таварыш.

Жыццёвая біяграфія яе багата падзеямі. Кожны дзень, дзякуючы акружаючаму, з былой пастушкі фармуецца высокасвядомы культурны чалавек, дзяржаўны дзеяч.

Усе гады марыла аб вучобе. У 1934 г. Клаўдзію Амосаўну пасылаюць ў Вышэйшую Комуністычную сельскагаспадарчую школу імя Леніна. Тры гады вучобы многа далі, сама адчувала, што на галаву вышэй стала.

У гэтыя гістарычныя, памятныя, незабыўныя дні выбарчай кампаніі беларускі народ, партыя Леніна—Сталіна аказалі ёй двайное давер'е. Яна старшыня Цэнтральнай выбарчай Камісіі БССР. У самы разгар кампаніі працоўныя пагранічнага Заслаўля калгаснікі, пагранічнікі папрасілі яе згоды балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Заслаўльскай сельскай акрузе. Людзі граніцы адчуваюць вялікае давер'е да маладога большэвіка, выхаванага большэвіцкай партыяй і тав. Сталіным. Яны паважаюць яе актыўнасць, яе бязмежную адданасць народу і яны, як адзін, аддадуць за яе свае галасы.

Е. Садоўскі.

Выбаршчыкі вітаюць кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных

БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА САРАТНІКА СТАЛІНА

Мне 50 год. Некаторыя называюць мяне старой, але я сябе зусім не лічу старой, бо ў нашай квітнеючай краіне соцыялізма старэць не хочацца.

Хіба я магла-б дарэволюцыйны час вучыць сваіх дзяцей? Гэта маглі рабіць толькі багацеі, а мне—хатняй работніцы—і думаць нельга было.

Зараз у мяне два сыны тэхнікі, адзін зараз у Чырвонай Арміі, а дачка канчае 10-ы клас. У гуртку па вывучэнню „Палажэння аб выбарах" і Канстытуцыі БССР я з'яўляюся старастам. У гуртку займаецца 39 чалавек, усе акуратна наведваюць заняткі. Займаюцца жанчыны, якія маюць 65—70 і больш гадоў. Яны прымаюць вельмі актыўны ўдзел у занятках. Яны выступаюць, расказваюць маладым жанчынам аб лёсе працоўных да рэволюцыі. Гурток таксама правёў рад экскурсій па прадпрыемствах горада.

На долю выбаршчыкаў Валадарскай выбарчай акругі выпала найвялікшае шчасце—галасаваць за саратніка вялікага Сталіна—Андрэя Аляксандравіча Жданава. Вестка аб тым, што тав. Жданаў будзе балатыравацца па нашай акрузе, была вялікім святам для ўсіх нас. Тое, што найлепшы сын нашай партыі будзе балатыравацца па нашай акрузе, абавязвае нас падрыхтавацца да выбараў на выдатна.

Вялікі гонар і радасць ахапляе, што мы будзем галасаваць за тав. Жданава па нашай акрузе.

26 чэрвеня мы ўсе, як адзін, аддадзім свае галасы за саратніка вялікага Сталіна—Андрэя Аляксандравіча Жданава. Гэтым мы яшчэ раз прадэманструем перад усім светам гарачую любоў да радзімы, да любімага правадыра і настаўніка Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Э. М. Баравінская.

Віцебск—10-й участак Валадарскай выбарчай акругі

НАЙВЯЛІКШАЯ РАДАСЦЬ

Неперадаваемае пачуццё радасці ахапіла мяне, як і ўвесь беларускі народ, калі я даведалася, што таварыш Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі тт. Молатаў, Варашылаў, Каганавіч, Ежоў, Калінін, Жданаў, Мікаян, Андрэеў далі згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР.

Беларускі народ заўсёды абкружан найвялікшымі клопатамі з боку любімых кіраўнікоў партыі і асабліва таварыша Сталіна. Дзякуючы штодзённым клопатам дарагога і любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна наша рэспубліка з былой царскай калоніі ператварылася ў квітнеючы сад, у якім радасна і шчасліва жыве беларускі народ.

Асабліва радасна нам, працоўным жанчынам. Мы атрымалі такое жыццё, аб якім не маглі і марыць нашыя мацеры. Мы пераносілі знясільваючую работу на капіталістаў. Жылі поўгалодныя, у цесных і вільготных падвалах. Здзекі і зняважі пераносілі мы ў старыя часы.

Мне гэтыя пакуты добра запомніліся. З 11 год я паступіла працаваць на скурзавод да гаспадара-эксплаататара.

Як непадобна маё дзяцінства на дзяцінства маёй дачкі! Ёй 12 год, яна вучыцца ў пятым класе адной з цудоўных сталінскіх школ, вучыцца ў музычнай школе.

Сама працую на соцыялістычным прадпрыемстве, з'яўляюся стаханаўкай, актыўна ўдзельнічаю ў грамадскім жыцці. Жыву я, як і сотні нашых рабочых, у добра абсталяванай, утульнай кватэры.

Як весела дома, калі мы ўсе збіраемся пасля работы, слухаем радыё, чытаем кніжкі, газеты! Часта наведваем тэатр, кіно.

І ўсё гэта цудоўнае жыццё нам дала совецкая ўлада, наш родны правадыр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Як-жа мне, свабоднай жанчыне, не любіць сваю родную комуністычную партыю, не галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных?!

Мне выпала асаблівае шчасце. Я буду галасаваць за баявога саратніка таварыша Сталіна—Нікалая Іванавіча Ежова.

Я з найвялікшай радасцю аддам свой голас за дарагога Нікалая Іванавіча Ежова—вернага саратніка т. Сталіна.

Д. М. Грынман.

Віцебск, стаханаўка фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі".

НЕБЫВАЛАЕ ШЧАСЦЕ

Набліжаецца гістарычная дата—26 чэрвеня— дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР. У гэты дзень працоўны народ Совецкай Беларусі аддасць свае галасы лепшым сынам і дачкам нашай неабдымнай радзімы.

На маю долю выпала асабліва вялікае шчасце і гонар. Я буду галасаваць за бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна—Вячэслава Міхайлавіча Молатава. 26 чэрвеня, калі я аддам свой голас за любімага тав. Молатава, за совецкі ўрад, за комуністычную партыю, за роднага таварыша Сталіна, будзе самым шчаслівым днём. Я аддам свой голас за таго, хто зрабіў наша жыццё такім шчаслівым.

А наша жыццё стала зусім непазнавальным і непараўнаным з мінулым. Я ў мінулым дачка беззямельнага селяніна. У бацькі майго было 11 душ сям'і і ўсе, як адзін, у тым ліку і я, непісьменныя. Зараз я працую на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай. З'яўляюся стаханаўкай. Нормы выпрацоўкі выконваю на 215 і больш процантаў. Заработная плата мая высокая. Жыву заможна. Дзеці мае вучацца. Старэйшы сын ў 9 класе, выдатнік вучобы, мадэліст. Хоць я непісьменнай засталася, затое дзеці вучацца. Совецкая ўлада забяспечыла для працоўных усе правы.

Шпак Анна Міхайлаўна.

Менск.

НА ЗДЫМКУ: група дэлегатаў XVII з'езда КП(б)Б, злева направа: сакратар Мсціслаўскага РК КП(б) тав. І. А. Маркаў, сакратар Дрысенскага РК КП(б)Б тав. С. К. Шахметаў, сакратар парткома Віцебскага Ветзааінстытута т. М. М. Астроўская, старшыня Мсціслаўскага РВК т. Г. В. Казлоў, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР—дырэктар Віцебскай фабрыкі „КІМ" тав. Е. С. Ханіна, начальнік палітаддзела Жлобінскага адлзялення чыгункі З. К. Сенчыла, Віцебскі райваенком тав. П. Ф. Люсін і кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР—сакратар Клімавіцкага РК КП(б)Б тав. В. Ф. Харланава.

Фота Мазелева (СФ).

ЗА БЛОК КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

У прайшоўшых выбарах у Вярхоўны Совет СССР я працавала агітатарам на выбарчым участку ў калгасе „Шлях Леніна", Мураўлянскага сельсовета. Я была вельмі зацікаўлена сваёй работай і ганарылася тым, што мне даверылі такі адказны ўчастак.

З выбаршчыкамі свайго калгаса мы добра вывучылі „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР", Канстытуцыю Саюза ССР і даклад таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным з'ездзе Советаў.

Пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР выбаршчыкі нашага калгаса сустрэлі з вялікім уздымам. Зараз мы ўзмоцнена рыхтуемся да выбараў. Я ўжо правяла больш 6 заняткаў у гуртку, на якіх вывучалі „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР", Канстытуцыю БССР. Калгаснікі акуратна наведваюць заняткі і добра рыхтуюцца да іх. На апошніх занятках мы падагулілі прапрацаваны матэрыял. Выявілася, што калгаснікі нядрэнна засвоілі выбарчы закон і Канстытуцыю БССР.

Зараз я арганізоўваю вывучэнне „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР" і Канстытуцыі ў хатах калгаснікаў і калгасніц са старымі і мацерамі з малымі дзецьмі, якія не могуць наведваць заняткі.

Мы прыступаем да вывучэння прамовы таварыша Сталіна на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы з тым, каб кожны выбаршчык ведаў, якія патрабаванні павінны ставіць выбаршчыкі перад дэпутатамі. Для вывучэння Сталінскага дакумента скарыстаем патэфон.

Мне, як настаўніцы, прыходзіцца шмат працаваць па ліквідацыі непісьменнасці. За зімовы час я падрыхтавала 15 чалавек, якія зараз чытаюць і пішуць. Да дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР даб'юся таго, што ў калгасе будзе зусім ліквідавана непісьменнасць.

Агітацыя за вылучаных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ускладае на нас, агітатараў, сур'ёзную і адказную работу.

Я мабілізую ўвагу выбаршчыкаў на тое, што мы павінны ўзмацніць класавую пільнасць, бо застаўшыяся недабітыя варожыя элементы, шкоднікі і шпіёны будуць усяляк шкодзіць нам у правядзенні выбарчай кампаніі. Мы павінны навучыцца распазнаваць і выкрываць ворагаў народа.

Выбаршчыкі майго калгаса ў гэты незабыўны дзень—26 чэрвеня—дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР усе, як адзін, пойдуць да урнаў і аддадуць свае галасы за кандыдатаў нерасможнага блока комуністаў і беспартыйных.

Агітатар Соня Данілаўна Марозава.

Ветрыно.

РАБОТА НА ЎЧАСТКУ

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР 12 снежня 1937 г. паказалі бліскучую перамогу Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Пры выбарах Вярхоўнага Совета БССР мы павінны дабіцца яшчэ лепшых рэзультатаў.

Для гэтага патрэбна паставіць на адпаведную вышыню арганізацыйную работу на ўчастку, бо выбарчы ўчастак з'яўляецца важнейшым месцам, дзе рашаецца поспех выбараў.

Як мы на 4-м выбарчым участку Менскай-Молатаўскай выбарчай акругі прыступілі да вырашэння важнейшай палітычнай задачы?

Мы пачалі з таго, што культурна абставілі ўчастак. Абсталёван агітпункт, які абстаўлен мяккай мэбляй і ў нагляднай форме адлюстраваны задачы выбарчай кампаніі.

Хатнія гаспадыні-выбаршчыкі слухаюць грамафонныя запісы даклада таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным з'ездзе Советаў і выступленне перад выбаршчыкамі Сталінскай акругі горада Масквы 11 снежня 1937 г.

Намі створана 37 гурткоў сярод хатніх гаспадынь, якімі ахоплена 470 чалавек; падабраны лепшыя комуністы, комсамольцы і беспартыйныя і вылучаны для работы ў якасці агітатараў. Перад кожным заняткам агітатар атрымоўвае інструктаж. Трэба адзначыць найлепшых нашых агітатараў тт. Фідлера Наума, Крыцкага Язэпа і другіх.

Выдатна тое, што ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР вылучаецца новы актыў агітатараў, які вельмі добра праводзіць агітацыйную работу, да такіх трэба аднесці тт. Тунік Геню і Крыцкага Владзіміра.

Расце таксама і актыў сярод жанчын—хатніх гаспадынь (тт. Хавіна, Казлоўская, Пеймер). Яны вельмі ўтульна абсталявалі пакоі, дзе адбываюцца заняткі гурткоў, своечасова забяспечваюць яўку хатніх гаспадынь на заняткі, арганізоўваюць слуханне апошніх паведамленняў па радыё і г. д.

Кіраўнікі і слухачы гурткоў заключылі дагаворы на соцспаборніцтва, узяўшы на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Многія хатнія гаспадыні праяўляюць на занятках вельмі вялікую актыўнасць і зацікаўленасць. Характэрна ў гэтых адносінах выступленне некаторых хатніх гаспадынь.

Вось, напрыклад, хатняя гаспадыня Тацьяна Проценка, пражываючая ў пасёлку Пушкіна, дом № 6, 65 год. Пры вывучэнні артыкула Канстытуцыі, дзе гаворыцца, што ваеннаслужачыя карыстаюцца ў нас роўным правам пры выбарах з усімі грамадзянамі, калі агітатар пачаў гаварыць, што гэтага няма ў капіталістычных краінах, Проценка Тацьяна папрасіла слова і расказала, як у старой царскай арміі здзекваліся над яе мужам і братам, якія былі салдатамі; яна расказала, як многа разоў яе муж атрымоўваў зубатычыны ад афіцэраў.

Або хатняя гаспадыня Якуцік—60 год, пражывае па Лагойскаму тракту. Калі гаварылі аб нашых дасягненнях, папрасіла слова і, пацвярджаючы расказ агітатара, сказала:

— Раней пры цары жыцця нам не было, а цяпер усё для нас робіцца, і на дзетак радасна і прыемна паглядзець, кожны дзень нам усё становіцца лепш жыць і ўсё гэта нам даў наш правадыр таварыш Сталін. Вось чаму я пры выбарах у Вярхоўны Совет СССР з радасцю галасавала за тав. Варашылава. З такой-жа радасцю я буду галасаваць за жалезнага Наркома абароны, за слаўнага саратніка таварыша Сталіна Клімента Ефрэмавіча Варашылава і цяпр.

Выбаршчыца тав. Каплан заяўляе:

— Пры выбарах у Вярхоўны Совет СССР я галасавала трэцяй па ліку, цяпер я прыду раней за ўсіх і буду галасаваць першай.

Я ганаруся тым, што на маю долю выпаў гонар і шчасце быць старшынёй выбарчага ўчастка ў той акрузе, дзе балатыруецца першы маршал Совецкага Саюза, палкаводзец нашай доблеснай Чырвонай Арміі Клім Ефрэмавіч Варашылаў.

Мы даб'ёмся ў дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР — 26 чэрвеня 100-процантнага ўдзелу ўсіх выбаршчыкаў у выбарах.

М. З. Хазан.

Старшыня выбарчага ўчастка № 4 Менскай-Молатаўскай выбарчай акругі.

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

Калі калектыў друкарні „Звязды" вылучаў маю кандыдатуру ў участковую выбарчую камісію, я нават некалькі палохалася,—ці не будзе для мяне цяжка? Аднак гэтыя цяжкасці я не адчуваю. Я ўключылася поўнасцю ў работу і аддана працую, памятаючы, што мне аказалі вялікае давер'е і я буду старацца з усіх сіл апраўдаць гэта давер'е.

Я зараз знаёмлюся з выбаршчыкамі на ўчастку. Цікаўлюся, як з выбаршчыкамі вывучаюць выбарчы закон і Канстытуцыю. У часе майго дзяжурства на ўчастку прыходзяць выбаршчыкі, я ім адказваю на ўсе цікавячыя іх пытанні.

Я бязмежна рада, што на маю долю выпала выконваць такую ганаровую работу,—быць членам участковай камісіі. Калі я даведалася, што родны таварыш Сталін і яго саратнікі тт. Молатаў, Варашылаў, Калінін, Каганавіч, Мікаян, Ежоў, Андрэеў і Жданаў далі згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР, бязмежная радасць ахапіла мяне.

Гэта гістарычная падзея ў жыцці ўсяго шчаслівага, радаснага, заможнага і свабоднага беларускага народа ніколі не згладзіцца з памяці. Гэта абавязвае мяне, як і кожнага працоўнага Беларусі, працаваць яшчэ лепш і падрыхтавацца да дня выбараў на выдатна.

Лавіт—работніца друкарні.

Менск.

ЗА ПЕРШАГА МАРШАЛА

26 чэрвеня я, як і мільёны совецкіх грамадзян, буду выбіраць наш вярхоўны орган улады—Вярхоўны Совет БССР.

Гэта вялікая радасць для ўсіх нас. Няма слоў, каб выразіць пачуцці, якія агортваюць мяне. З найвялікшай радасцю я буду галасаваць за нашага кандыдата Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Я ўспамінаю жыццё маёй маці да рэволюцыі. Невясёлае гэта было жыццё. Дзяцей яна нараджала там, дзе працавала. (Яна была па прафесіі грузчыцай). Да апошняй мінуты ёй трэба было працаваць, бо калі ў той час не выйсці хаця-б адзін дзень на работу—сям'я заставалася галоднай. Зусім іншае зараз. Я адпачывала два месяцы да радоў і два месяцы пасля іх.

Я раджала ў чыстым, прасторным радзільным доме. Мяне даглядаюць лепшыя ўрачы.

Дзе, у якой краіне, таварышы, працоўная жанчына мае такія правы, такія магчымасці? Вы не знойдзеце больш такой краіны, акрамя нашага вялікага Совецкага Саюза, які пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна ідзе ад перамогі да перамогі.

Як-жа я магу не галасаваць за бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна—жалезнага Наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава, не галасаваць за таго, хто ўсё сваё жыццё аддае нам, працоўным, хто стварыў і стварае нам цудоўнае жыццё.

Дарагія таварышы! У мяне ёсць дзеці. Яны ўжо зараз выбіраюць сабе прафесіі. Старэйшая дачка жадае быць архітэктарам. І я ўпэўнена, што яна ім будзе. За лёс сваіх дзяцей я спакойна. Ім адкрыты ўсе дарогі. Маім дзецям не прыдзецца паспытаць таго, чаго паспыталі іх бацькі, бо аб іх клапаціцца наш любімы, родны таварыш Сталін.

Таварышы хатнія гаспадыні нашай Молатаўскай выбарчай акругі! Я заклікаю вас усіх галасаваць за нашага жалезнага наркома, першага маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава.

Няхай жыве наша сонца—наш бацька, друг і настаўнік, вялікі рулявы, які вядзе вялікі наш карабль да комунізма—таварыш Сталін!

Менск. **Клеянкіна.**

ЯК Я СТАЛА АКТЫВІСТКАЙ

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР 12 снежня 1937 г. на аснове Сталінскай Канстытуцыі ўскалыхнулі шырокія масы жанчын і выклікалі да жыцця новыя творчыя сілы. Суджу я па сабе. Я і да гэтага часу чытала газеты, цікавілася ўсім, што адбывалася і адбываецца ў нашай краіне і за яе межамі.

Аднак актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці не прымала. Дастаткова было нязначнай прапановы грамадскіх арганізацый, як я, хатняя гаспадыня, стала энергічна ўдзельнічаць у праверцы спісаў выбаршчыкаў, запаўненні павестак і іншай звязанай з выбарамі рабоце сярод выбаршчыкаў нашага выбарчага ўчастка. У гістарычны дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР—12 снежня 1937 г. я дзяжурыла на ўчастку і сачыла за парадкам, каб не ствараліся чаргі і ніякіх тормазаў пры ажыццяўленні нашымі многамільённымі выбаршчыкамі сваіх грамадзянскіх правоў. Добраахвотна, з вялікай радасцю я ўсё гэта рабіла і гэты час застанецца ў маёй памяці назаўсёды.

У сучасных выбарах у Вярхоўны Совет БССР мая работа больш складаная і больш адказная, але тым больш яна мне прыемна. Мопраўская арганізацыя вылучыла маю кандыдатуру—беспартыйную хатнюю гаспадыню—членам выбарчай камісіі. Гэты вялікі гонар і давер'е я стараюся апраўдаць. Я член выбарчага ўчастка № 2 Молатаўскай выбарчай акругі горада Менска.

Многа рабіла і раблю для добрага афармлення нашага ўчастка. Правярала спісы выбаршчыкаў і стараюся, каб усе выбаршчыкі да аднаго прымалі ўдзел у галасаванні за нашага любімага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларусі Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Што можа быць вышэй, чым свабодныя выбары ў самай дэмакратычнай краіне, грамадзяне якой на аснове Сталінскай Канстытуцыі забяспечаны правамі на свабоднае і шчаслівае жыццё. І выбаршчыкі ў дзень 26 чэрвеня 1938 г. апусцяць свае бюлетэні ў урны з прозвішчам свайго любімага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР жалезнага наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Марыя Пеймер.



На здымку: Гурток па ліквідацыі непісьменнасці. Хатнія гаспадыні к дню выбараў у Вярхоўны Совет Беларускай ССР ліквідуюць сваю непісьменнасць.

Выбары ў СССР—самыя дэмакратычныя выбары ў свеце

ПАМЯЦІ МАРЫІ ІЛЬІНІЧНЫ УЛЬЯНАВАЙ

Год назад, 12 чэрвеня 1937 года, памерла Марыя Ільінічна Ульянава, сястра Владзіміра Ільіча Леніна, старэйшы баец вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Увесь шлях, ад пачатку яе свядомага жыцця да апошняй мінуты, Марыя Ільінічна была да канца адданай справе партыі, яна з непрымірымасцю адносілася да ворагаў народа, да здраднікаў нашай соцыялістычнай радзімы.

Марыя Ільінічна Ульянава была бліжэйшым памочнікам вялікага генія чалавецтва Владзіміра Ільіча Леніна. Яшчэ ў гады падполля, калі Владзімір Ільіч быў у эміграцыі і калі яму неабходны былі адпаведныя весткі, кнігі і інфармацыі з Расіі, ён заўсёды зварачаўся па гэтай справе да Марыі Ільінічны.

Перапіска, якая вялася паміж Владзімірам Ільічом і Марыяй Ільінічнай, сведчыць аб вялікай дружбе брата з сястрой, у якой спалучалася большэвіцкая дружба двух рэволюцыянераў. У адным з пісем сваіх да Марыі Ільінічны Ленін пісаў: „Вельмі ўжо цяжка ў нашым (у тваім і маім асабліва) палажэнні весці перапіску як хочацца".

Вялікі ўдзел Марыя Ільінічна прымала ў рабоце іскраўскай арганізацыі. У канцы 1899 г. Марыя Ільінічна варочалася ў Маскву. У хуткім часе яна пачынае прымаць дзейны ўдзел у „Іскры", пасылае ў газету карэспандэнцыі і інфармацыі. Пасля лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1917 г. з энтузіязмам пачынае працаваць у цэнтральным органе нашай партыі—„Правда", аддаючы ўсе сілы на гэтым адказнейшым участку работы. Была членам рэдкалегіі і адказным сакратаром „Правды".

Жыццёвы шлях Марыі Ільінічны—гэта шлях няспыннай рэволюцыйнай дзейнасці, гэта пастаянны нагляд за ёй паліцыі, арышты, турмы і ссылкі.

У 1899 г. Марыя Ільінічна была арыштавана ў Маскве. Праз два тыдні была вызвалена і выслана пад асабісты нагляд паліцыі ў Н.-Ноўгарад. У пачатку 1901 г. яна зноў арыштоўваецца і пасля некалькіх месяцаў турмы адбывае на працягу года зноў гласны нагляд паліцыі. У студзені 1904 г. Марыя Ільінічна была арыштавана разам з групай рэволюцыянераў. Паліцыя ні на мінуту не выпускала Марыю Ільінічну з-пад свайго нагляду і ў 1910 г. пасля звароту яе ў Маскву з эміграцыі, зноў арыштоўваецца. Нарэшце, у 1911 г. яе арыштавалі і выслалі ў Валагодскую губернію, тэрмінам на тры гады.

Аднак ні арышты, ні ссылкі, ні строгае праследванне царскай жандармерыі і паліцыі не зламалі волю і энергію загартаванага прафесіянальнага рэволюцыянера Марыю Ільінічну Ульянаву. Усюды і заўсёды яна праводзіла вялікую работу па арганізацыі і згуртоўванні большэвіцкай партыі, па арганізацыі рабочага класа на барацьбу з самадзяржаўем.

Больш пяці год Марыя Ільінічна ўзначальвала бюро скарг. К кожнай заяве і скарзе працоўных яна праяўляла чулыя большэвіцкія адносіны. Усё сваё жыццё на ўсіх участках работы, куды яе пасылала партыя, яна з асаблівай энергіяй і энтузіязмам аддавалася рабоце. Усе свае сілы яна бязмежна аддана прысвячала справе рабочага класа, справе пабудовы соцыялізма.

На пахаванні Ульянавай выступаўшы тав. Чубар ад ЦК ВКП(б) і ўрада сказаў: „У асобе М. І. Ульянавай партыя страціла старэйшага свайго барацьбіта, бязмежна адданага справе Леніна—Сталіна. Партыя страціла выдатнага чалавека, скромнага, чулага таварыша, памочніка Вялікага Леніна ў яго барацьбе за стварэнне партыі большэвікоў і за арганізацыю працоўных мас пад сцягам Маркса—Энгельса.

Працоўныя Совецкага Саюза страцілі аднаго з выдатных прадстаўнікоў слаўнага пакалення рэволюцыйных барацьбітоў, якія ўсё сваё жыццё аддалі барацьбе за соцыялізм, за пабудову ў нашай краіне—краіне перамогшага соцыялізма, комуністычнага грамадства".

Такой засталася Марыя Ільінічна ў сэрцах і памяці ўсіх працоўных.

ШТО ЧЫТАЦЬ Жанчына ў грамадзянскай вайне

Зборнік „Жанчына ў грамадзянскай вайне" складаецца з успамінаў непасрэдных удзельніц гераічных баёў за совецкую ўладу і расказаў аб гераінях, аддаўшых сваё жыццё ў барацьбе за светлае будучае, за комунізм.

Зборнік пачынаецца расказам Зінаіды Орджанікідзе, баявым таварышом і вернай спадарожніцай аднаго з лепшых сыноў большэвіцкай партыі Серго Орджанікідзе.

Тамара Рэзакова ўспамінае аб гістарычным выступленні таварыша Сталіна на ўстаноўчым горскім з'ездзе, аб сустрэчах і сумеснай рабоце з Сяргеем Міронавічам Кіравым і Серго Орджанікідзе, аб большэвіцкім падполлі у меншавіцкай Грузіі, аб слаўных пераходах і бітвах у гарах Каўказа.

Былая табачніца з горада Нікалаева Зіна Патрыкеева, узнагароджаная за баявыя подвігі ордэнам Чырвонага Сцяга, расказвае аб сваім баявым шляху, пройдзеным пад кіраўніцтвам маршалаў Совецкага Саюза К. Е. Варашылава і С. М. Будзённага ў радах слаўнай Першай коннай у якасці радавога байца, медычнай сястры, кулямётчыка, памочніка эскадроннага камісара.

Тав. Кананенка прысвячае свой расказ „Шэсць" памяці крэменчугскіх табачніц—комсамолак, гераічна загінуўшых ад рук белагвардзейскіх катаў.

Е. К. („Работница", № 14).

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3560. Тыраж 11.700 экз. Галоўлітбел № 4804.
Здана ў друкарню 7/VI-38 г. Падпісана к друку 22/VI-38 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

ЦАНА 20 кап.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎНУТРАНАЯ ПАЗЫКА ЎМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ САЮЗА ССР

Бяспройгрышны выпуск

ДАВЕДАЧНАЯ ТАБЛІЦА ПЕРШАГА ТЫРАЖА ВЫЙГРЫШАЎ

Тыраж выйгрышаў адбыўся 5 і 6 чэрвеня 1938 г. у г. Менску, Беларускай ССР.

У 1-м тыражы выйгрышаў „Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР" выйгрышы выпалі на наступныя нумары серый і аблігацый ва ўсіх 53 разрадах бяспройгрышнага выпуска пазыкі (у суму выйгрыша ўключаецца нарыцацельны кошт аблігацыі):

№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях
20184	07*)	500	26104	1—50	200	33598	1—50	200
20262	02*)	500	26230	1—50	200	33660	1—50	200
20350	1—50	150	26834	03*)	500	34108	1—50	150
20438	32*)	500	26854	1—50	200	34282	09*)	1000
20512	27*)	500	27286	36*)	500	34528	1—50	200
21035	1—50	150	27668	1—50	200	34918	1—50	200
21094	30*)	500	27890	1—50	150	35030	1—50	150
21116	38*)	1000	28024	47*)	500	35040	1—50	150
21240	1—50	150	28389	19*)	500	35211	1—50	150
21350	39*)	500	28501	46*)	500	35409	45*)	500
21635	1—50	150	28561	28*)	500	35590	40*)	500
21813	47*)	500	28613	1—50	200	35786	38*)	500
21851	1—50	150	28720	28*)	500	35956	1—50	150
22424	1—50	200	28835	13*)	500	35973	07*)	500
22647	36*)	500	29116	45*)	500	36379	25*)	500
22725	38*)	500	29128	1—50	150	36906	04*)	500
22761	30*)	500	29346	1—50	200	37271	1—50	150
23172	27*)	500	29358	44*)	500	37397	1—50	150
23611	1—50	200	29726	43*)	500	37634	1—50	150
23808	1—50	150	29911	1—50	150	37894	1—50	200
23833	42*)	500	29943	14*)	1000	38179	1—50	200
24305	24*)	500	30028	47*)	500	38225	33*)	500
24444	34*)	1000	30959	1—50	150	38511	1—50	150
24556	06*)	500	30997	39*)	500	38715	50*)	500
24717	17*)	500	31531	15*)	500	38796	03*)	500
24997	1—50	200	31605	04*)	3000	39038	43*)	500
25003	27*)	500	32049	38*)	500	39078	1—50	150
25150	1—50	200	32072	05*)	1000	39183	1—50	150
25243	41*)	500	32080	1—50	200	39248	40*)	500
25433	09*)	500	32451	48*)	500	39289	44*)	500
25783	46*)	500	32789	23*)	500	39302	04*)	500
25807	1—50	150	32915	50*)	500	39679	1—50	200
25841	1—50	150	33384	1—50	200	39836	1—50	150
25947	1—50	200						

*) Астатнія 49 нумароў аблігацый гэтай серыі выйгралі па 150 рублёў кожны.